КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____ А.В.Макоўчык
“22” 06 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-27-3-н4-2023/вуч.

ПЕДАГАГІЧНАЯ РЫТОРЫКА

Вучэбная праграма ўстановы выйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці: 6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі ОСВО 6-05-0112-02-2023 (__.__._____, № __) і вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя (__.__._____, № - _____ / .)

СКЛАДАЛЬНІК: .

А.С.Васілеўская, загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

А.М.Пісарэнка, загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

В.В.Труцько, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

УЗГОДНЕНА

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Пачатковая школа № 103 г. Мінска»

_____ М.А.Макарэвіч

«__» _____ 2023 г.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
пратакол № 10 ад 13.04.2023

Загадчык кафедры

_____ А.С.Васілеўская

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
пратакол № 6 ад 21.06.2023

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзейным патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела

_____ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі

_____ Н. П. Сяткоўская

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Педагагічная рыторыка – гэта дысцыпліна, якая дапамагае студэнтам рэалізаваць сябе ў прафесійнай дзейнасці, сфарміраваць кампетэнтную асобу, адкрытую для зносін, здольную да супрацоўніцтва, міжкультурнага ўзаемадзеяння. Дысцыпліна дае магчымасць авалодаць навыкамі паспяховай камунікацыі – самым важным інструментам дасягнення сацыяльнага і прафесійнага паспеху.

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны

Мэта вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі будучага педагога на аснова авалодання законамі эфектыўных прафесійных зносін.

Задачы вучэбнай дысцыпліны*:*

- авалодаць ведамі пра сутнасць, правілы і нормы прафесійных зносін, пра патрабаванні да маўленчых паводзін у розных маўленча-камунікатыўных сітуацыях,
- авалодаць камунікатыўна-маўленчымі ўменнямі,
- пазнаёміць з асноўнымі напрамкамі і спосабамі эфектыўнага маўленчага ўдзеяння,
- авалодаць вопытам аналізу і стварэння прафесійна значных тыпаў выказвання,
- выпрацаваць навыкі выразнага чытання мастацкіх твораў розных жанраў.

Вучэбная дысцыпліна мае тэарэтыка-практычны характар: акрамя знаёмства з асноўнымі тэарэтычнымі паняццямі, прадугледжана выпрацоўка практычных навыкаў маўленчага ўздзеяння.

Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі

Вучэбная дысцыпліна “Педагагічная рыторыка” з’яўляецца дысцыплінай кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі, уваходзіць у модуль “Камунікатыўная культура педагога” і звязана з вучэбнымі дысцыплінамі “Беларуская мова”, “Руская мова”, “Методыка выкладання рускай мовы”, “Методыка выкладання беларускай мовы”, “Методыка развіцця маўлення”, “Методыка выкладання літаратурнага чытання”, “Фарміраванне білінгвальнага адукацыйнага асяроддзя”.

Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Педагагічная рыторыка” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў універсальнай кампетэнцыі УК-12: Выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці.

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

ведаць:

- спецыфіку педагагічных зносін;
- асаблівасці кніжнай і размоўнай форм маўлення;
- асаблівасці вуснай і пісьмовай форм зносін;
- асноўныя віды маўленчай дзейнасці;
- камунікатыўныя якасці добрага маўлення;
- этапы падрыхтоўкі публічнага выступлення;
- спецыфіку падрыхтоўкі да выразнага чытання твораў;

умець:

- ствараць тэксты розных стыляў і жанраў;
- будаваць выказванне ў адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы;
- аналізаваць тэксты розных жанраў;
- эфектыўна выкарыстоўваць сродкі мовы ў розных сітуацыях і жанрах педагагічных зносін;
- аргументавана выкладаць свой пункт гледжання;

валодаць:

- навыкамі аналізу маўлення і выпраўлення памылак;
- нормамі літаратурнай мовы;
- навыкамі стварэння і апрацоўкі розных тыпаў тэкстаў;
- навыкамі адбору і вывучэння матэрыялу па тэме выступлення;
- навыкамі выразнага чытання.

Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, што адводзяцца на вывучэнне дысцыпліны

Дысцыпліна вывучаецца на 1 курсе ў 1 семестры. Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны разлічана на 100 вучэбных гадзін, з якіх 56 аўдыторных для дзённай формы атрымання адукацыі, у тым ліку 16 лекцыйных (з іх 2 на КСР) і 40 практычных (з іх 6 на КСР). На самастойную работу адводзіцца 44 гадзіны.

У 1 семестры форма кантролю – залік.

На завочнай форме атрымання адукацыі дысцыпліна вывучаецца на 1 курсе (ва ўстановачную сесію). Вывучэнне дысцыпліны разлічана на 14 аўдыторных гадзін, у тым ліку 4 – лекцыйныя, 10 – практычных.

У 1 семестры форма кантролю – залік.

На завочнай формы атрымання адукацыі скарочанага тэрміну навучання дысцыпліна вывучаецца на 1 курсе (ва ўстановачную сесію). Вывучэнне дысцыпліны разлічана на 10 аўдыторных гадзін, у тым ліку 2 – лекцыйныя, 8 – практычных.

Форма кантролю – залік (1 семестр).

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

1. Агульная і педагагічная рыторыка

Рыторыка як навука і мастацтва. Розныя падыходы да азначэння рыторыкі. Прадмет і задачы педагагічнай рыторыкі. Спецыфіка педагагічных зносін. Камунікатыўная сітуацыя і яе элементы.

2. Маўленчая дзейнасць настаўніка

Паняцце пра маўленчую дзейнасць. Мова і маўленне, іх асноўныя функцыі. Этапы маўленчай дзейнасці. Вуснае і пісьмовае маўленне. Паняцце пра маналог, дыялог, палілог.

Віды маўленчай дзейнасці: слуханне, пісьмо, гаварэнне, чытанне. Культура чытання і слухання. Асаблівасці слухання як віда маўленчай дзейнасці. Віды, спосабы, прыёмы слухання. Чытанне як від маўленчай дзейнасці. Віды чытання. Праблема разумення.

Тэкст як прадукт маўленчай дзейнасці. Прыметы тэксту.

Тэма і ідэя тэксту. Спосабы іх рэалізацыі. Інфарматыўнасць тэксту.

Звязнасць тэксту. Сродкі, якія забяспечваюць тэматычную, граматычную, сінтаксічную, лагічную сувязі сказаў у тэксце.

Структура тэксту. Абзац як кампазіцыйна-стылістычная адзінка тэксту. Кампазіцыя тэксту. Моцныя і слабыя пазіцыі ў тэксце. Зачын і заканчэнне. Этапы стварэння тэксту.

Аналіз узорных тэкстаў з пункту гледжання іх кампазіцыйных і моўных асаблівасцей.

Асноўныя тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне. Структура і моўныя асаблівасці тыпаў маўлення. Аналіз фрагментаў розных тыпаў маўлення.

Стылі і жанры маўлення. Паняцце пра стылі маўлення. Асаблівасці навуковага, афіцыйна-справавога, публіцыстычнага і мастацкага стыляў. Паняцце пра маўленчы жанр. Прынцыпы адбору і размяшчэння матэрыялу ў залежнасці ад стылю і жанру маўлення.

3. Культура маўлення ў прафесійнай дзейнасці

Культура маўлення як частка прафесійнай культуры настаўніка. Нарматыўны, камунікатыўны і этычны аспекты маўленчай культуры.

Маўленчы этыкет. Этыкетныя формулы. Нацыянальна-культурная спецыфіка маўленчых паводзін.

Камунікатыўныя якасці маўлення ў прафесійнай дзейнасці настаўніка.

Правільнасць як галоўная камунікатыўная якасць маўлення настаўніка. Крытэрыі правільнасці. Моўная норма і кадыфікацыя.

Тыпы літаратурных моўных нормаў: арфаэпічныя, арфаграфічныя, акцэнтныя, словаўтваральныя, лексічныя, граматычныя (марфалагічныя і сінтаксічныя). Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны парушэння літаратурных нормаў. Марфалагічная, сінтаксічная, фанетычная, лексічная, словаўтваральная і акцэнтная інтэрферэнцыя. Тыповыя памылкі ў маўленні настаўніка, іх класіфікацыя і спосабы папярэджвання.

Дакладнасць маўлення. Узаемасувязь прадметнай і паняційнай дакладнасці. Прафесійна-тэрміналагічная лексіка ў маўленні настаўніка. Выкарыстанне сінонімаў, паронімаў, амонімаў, мнагазначных слоў і дакладнасць маўлення. Дакладнасць у перакладзе. Лексіка-семантычная інтэрферэнцыя ва ўмовах беларуска-рускага білінгвізму як адна з прычын недакладнасці. Тыповыя памылкі, звязаныя з парушэннем дакладнасці, іх класіфікацыя і спосабы папярэджвання (выпраўлення).

Лагічнасць маўлення. Адзінства прадметнай і паняційнай лагічнасці. Моўныя сродкі стварэння і парушэння лагічнасці: парадак слоў, пазіцыя залежнай часткі і яе сувязь з назоўнікам (займеннікам) у складаназалежным сказе, аднародныя члены сказа, пропуск інфармацыі ці празмернасць выказвання. Лагічнасць маўлення і функцыянальныя стылі. Тыповыя памылкі, звязаныя з парушэннем лагічнасці, іх класіфікацыя і спосабы папярэджвання (выпраўлення).

Багацце і выразнасць маўлення. Вобразныя сродкі мовы. Паняцце пра рытарычны прыём. Паняцце пра троп. Разнавіднасці тропаў. Паняцце пра рытарычную фігуру. Асноўныя разнавіднасці фігур. Праблема эфектыўнасці выкарыстання сродкаў выразнасці мовы.

Чысціня маўлення. Паняцце пра чысціню маўлення. Прычыны парушэння чыціні маўлення.

Дарэчнасць маўлення. Віды дарэчнасці: стылістычная, кантэкстуальная, сітуацыйная, асобасна-псіхалагічная. Залежнасць дарэчнасці маўлення ад агульнай маўленчай і ўнутранай культуры чалавека. Тыповыя памылкі, звязаныя з парушэннем дарэчнасці маўлення, іх папярэджванне і выпраўленне.

Сцісласць маўлення. Сцісласць і закон моўнай эканоміі. Асноўныя сродкі лаканізацыі маўлення. Недастатковасць маўлення і шматслоўнасць як маўленчыя памылкі; спосабы іх папярэджвання і выпраўлення.

4. Асновы майстэрства публічнага выступлення

Тэхніка маўлення. Дыханне. Тыпы дыхання: фізіялагічны і фанацыйны (маўленчы); плечавы, грудны, рэберны, брушны (дыяфрагмавы), камбінаваны (рэберна-дыяфрагмавы). Залежнасць тыпу дыхання ад полу,

узросту, фізіялагічнага стану чалавека. Патрабаванні да правільнага дыхання. Практыкаванні на пастаноўку правільнага дыхання.

Моўны голас. Паказчыкі галасавых дадзеных: сіла і слабасць голасу, вышыня, палётнасць, вынослівасць, дыяпазон, рэгістр, мілагучнасць. Прафесійныя якасці аратарскага голасу. Недахопы аратарскага голасу. Умовы прафесійнага станаўлення голасу. Прычыны і асаблівасці парушэнняў голасу ў педагогаў.

Невербальныя сродкі зносін. Міміка і жэсты, іх класіфікацыя. Выяўленча-выразныя магчымасці жэстыкуляцыі.

Артыкуляцыя і дыкцыя. Артыкулятары: губы, зубы, пярэдняе і задняе нёба, язык, поласць носа. Недахопы артыкулятараў.

Спецыфіка публічнага маўлення. Падрыхтоўка публічнага маўлення. Этапы падрыхтоўкі маўлення і іх змест. Адбор і сістэматызацыя матэрыялу. Асноўныя прыёмы пошуку матэрыялу.

Кампазіцыя публічнага маўлення. Распрацоўка плана. Метады выкладу матэрыялу. Спосабы сувязі маўлення. Сродкі і спосабы ўстанаўлення кантакту з аўдыторыяй.

Палемічнае майстэрства. Аргументацыя. Структура і ход дыскусіі.

5. Выразнае чытанне

Выразнае чытанне як мастацкая дзейнасць. Выканальніцкі аналіз, яго адрозненне ад літаратуразнаўчага. Вучэнне К.Станіслаўскага.

Сэнсавы аналіз тэксту. Знаёмства са зместам твора. Асэнсаванне яго тэмы і ідэі. Кантэкст і падтэкст. Метады і прыёмы сэнсавага аналізу тэксту.

Вызначэнне тэматычных частак твора, фармуляванне задачы чытання кожнай з іх. Ідэйна-эстэтычны аналіз мастацкага твора. Лінгвастылістычны аналіз.

*Лагічны аналіз твор*а. Маўленчы такт. Дзяленне маўленчай плыні на маўленчыя такты.

Лагічныя паўзы. Паўзы і знакі прыпынку. Даўжыня паўз.

Лагічны націск. Функцыі лагічнага націску ў выказванні. Правілы пастаноўкі лагічнага націску. Лагічны націск і знакі прыпынку.

Эмацыянальная выразнасць чытання. Інтанацыя чытання мастацкага твора. Кампананеты інтанацыі. Сувязь інтанацыі са зместам твора. Інтанацыйны аналіз мастацкага твора. Прыёмы інтанавання.

План распрацоўкі чытання мастацкага твора. Паняцце пра партытуру. Партытурныя знакі. Графічнае абазначэнне паўз. Графічнае абазначэнне лагічнага націску. Трэніроўка чытання мастацкіх твораў з улікам распрацаванай партытуры.

Асаблівасці чытання мастацкіх твораў розных жанраў. Жанравыя асаблівасці чытання эпічных твораў. Літаратурныя казкі. Лагічны і эмацыянальна-вобразны аналіз. Расказванне народных казак. Чытанне апавяданняў.

Чытанне баек. Алегарычныя вобразы і асаблівасці іх слоўнага ўвасаблення.

Асаблівасці чытання лірычных твораў. Лірычны герой і чытальнік. Стварэнне ў аўдыторыі адпаведнага настрою.

Чытанне драматычных твораў. Родавыя асаблівасці драмы. Чытанне па ролях. Драматызацыя.

Асаблівасці чытання твораў малых фальклорных жанраў.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы заняткаў	Колькасць аўдыторных гадзін				СРС	Літаратура	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя заняткі	КСР				
				лекцыі	практ.			
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	**Агульная і педагагічная рыторыка**	**2**						
1.1	Рыторыка як навука і мастацтва	2					[1, 5, 6]	вуснае выказванне
2	**Маўленчая дзейнасць настаўніка**	**4**	**8**		**2**			
2.1	Паняцце пра маўленчую дзейнасць	2				2	[1, 3, 7]	складанне гласарыя
2.2	Тэкст як прадукт маўленчай дзейнасці		2			2	[1, 3, 7]	стварэнне камп’ютарнай прэзентацыі
2.3	Звязнасць тэксту		2				[1, 3, 7]	аналіз тэксту
2.4	Структура тэксту				2		[1, 3, 7]	аналіз тэксту
2.5	Асноўныя тыпы маўлення		2			2	[1, 3, 7]	складанне гласарыя
2.6	Стылі і жанры маўлення	2	2			2	[1, 3, 7]	тэст
3	**Культура маўлення ў прафесійнай дзейнасці**	**2**	**8**		**2**			
3.1	Культура маўлення як частка прафесійнай культуры настаўніка	2					[1, 5, 6]	вуснае выказванне

3.2	Правільнасць як галоўная камунікатыўная якасць маўлення настаўніка		2			4	[1, 3, 6, 7]	тэст
3.4	Дакладнасць маўлення		2			4	[1, 3, 6, 7]	дзелавая гульня
3.5	Лагічнасць маўлення		2			2	[1, 3, 6, 7]	напісанне эсе
3.6	Багацце і выразнасць маўлення				2		[1, 3, 6, 7]	вуснае выказванне
3.7	Чысціня маўлення. Дарэчнасць маўлення. Сцісласць маўлення		2			2	[1, 3, 6, 7]	дзелавая гульня
4	**Асновы майстэрства публічнага выступлення**	**2**	**8**	**2**				
4.1	Тэхніка маўлення	2				2	[1, 2]	вуснае выказванне
4.2	Артыкуляцыя і дыкцыя		2			2	[1, 2]	падбор заданняў
4.3	Спецыфіка публічнага маўлення. Падрыхтоўка публічнага маўлення		2	2			[1, 5]	вуснае выступленне
4.4	Кампазіцыя публічнага маўлення		2			2	[1, 5]	вуснае выступленне
4.5	Палемічнае майстэрства		2			4	[1, 5]	круглы стол
5	**Выразнае чытанне**	**4**	**10**		**2**			
5.1	Выразнае чытанне як мастацкая дзейнасць	2				2	[1, 2, 4]	вуснае выказванне
5.2	Сэнсавы аналіз тэксту		2			2	[1, 2, 4]	аналіз тэксту
5.3	Эмацыянальная выразнасць чытання				2		[1, 2, 4]	аналіз тэксту
5.4	Асаблівасці чытання мастацкіх твораў розных жанраў	2				2	[1, 2, 4]	
5.5	Жанравыя асаблівасці чытання эпічных твораў		4				[1, 2, 4]	распрацоўка партытуры
5.6	Асаблівасці чытання лірычных твораў		2			4	[1, 2, 4]	выразнае чытанне

5.7	Чытанне драматычных твораў. Асаблівасці чытання твораў малых фальклорных жанраў		2			4	[1, 2, 4]	інсцэніроўка
	Усяго:	***14***	***34***	***2***	***6***	***44***		***залік***

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі (5 г.н.))

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы заняткаў	Колькасць аўдыторных гадзін		Літаратура	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя заняткі		
1	2	3	4	5	6
І курс, установачная сесія					
1	**Агульная і педагагічная рыторыка**	**1**			
1.1	*Рыторыка як навука і мастацтва*. Прадмет і задачы педагагічнай рыторыкі. Спецыфіка педагагічных зносін. Камунікатыўная сітуацыя і яе элементы. Маўленчая сітуацыя	1		[1, 5, 6]	вуснае выказванне
2	**Маўленчая дзейнасць настаўніка**	**1**	**2**		
2.1	*Паняцце пра маўленчую дзейнасць*. Мова і маўленне, іх асноўныя функцыі. Віды маўленчай дзейнасці	1		[1, 3, 7]	
2.2	*Асноўныя тыпы маўлення. Стылі і жанры маўлення.* Апавяданне, апісанне, разважанне. Асаблівасці навуковага, афіцыйна-справавога, публіцыстычнага і мастацкага стыляў.		2	[1, 3, 7]	аналіз тэкстаў

3	**Культура маўлення ў прафесійнай дзейнасці**		**2**		
3.1	Камунікатыўныя якасці маўлення ў прафесійнай дзейнасці настаўніка		2	[1, 3, 6, 7]	дзелавая гульня
4	**Асновы майстэрства публічнага выступлення**	**2**	**2**		
4.1	*Тэхніка маўлення*. Практыкаванні на пастаноўку правільнага дыхання		2	[1, 2]	выкананне практыкаванняў
4.2	*Спецыфіка публічнага маўлення*. Этапы падрыхтоўкі маўлення і іх змест. Адбор і сістэматызацыя матэрыялу. Асноўныя прыёмы пошуку матэрыялу.	2		[1, 5]	вуснае выказванне
5	**Выразнае чытанне**		**4**		
5.1	*Сэнсавы аналіз тэксту*. Знаёмства са зместам твора. Асэнсаванне яго тэмы і ідэі. Кантэкст і падтэкст. Метады і прыёмы сэнсавага аналізу тэксту.		2	[1, 2, 4]	распрацоўка партытуры
5.2	*Асаблівасці чытання мастацкіх твораў розных жанраў*. Жанравыя асаблівасці чытання эпічных твораў. Асаблівасці чытання лірычных твораў		2	[1, 2, 4]	выразнае чытанне
	Усяго:	***4***	***10***		
	І курс 1 семестр				***залік***

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі (3,5 г.н.))

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы заняткаў	Колькасць аўдыторных гадзін		Літаратура	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя заняткі		
1	2	3	4	7	8
І курс, установачная сесія					
1	**Агульная і педагагічная рыторыка**	**1**			
1.1	*Рыторыка як навука і мастацтва*. Прадмет і задачы педагагічнай рыторыкі. Спецыфіка педагагічных зносін. Камунікатыўная сітуацыя і яе элементы. Маўленчая сітуацыя	1		[1, 5, 6]	апытванне
2	**Маўленчая дзейнасць настаўніка**	**1**	**2**		
2.1	*Паняцце пра маўленчую дзейнасць*. Мова і маўленне, іх асноўныя функцыі. Віды маўленчай дзейнасці	1		[1, 3, 7]	
2.2	*Асноўныя тыпы маўлення. Стылі і жанры маўлення*. Апавяданне, апісанне, разважанне. Асаблівасці навуковага, афіцыйна-справавога, публіцыстычнага і мастацкага стыляў.		2	[1, 3, 7]	аналіз тэкстаў
3	**Культура маўлення ў прафесійнай дзейнасці**		**2**		
3.1	*Камунікатыўныя якасці маўлення ў прафесійнай дзейнасці*		2	[1, 3, 6,	дзелавая гульня

	настаўніка			7]	
4	**Асновы майстэрства публічнага выступлення**		**2**		
4.1	*Спецыфіка публічнага маўлення*. Этапы падрыхтоўкі маўлення і іх змест. Адбор і сістэматызацыя матэрыялу. Асноўныя прыёмы пошуку матэрыялу.		2	[1, 5]	вуснае выказванне
5	**Выразнае чытанне**		**2**		
5.1	*Асаблівасці чытання мастацкіх твораў розных жанраў*. Жанравыя асаблівасці чытання эпічных твораў. Асаблівасці чытання лірычных твораў		2	[1, 2, 4]	выразнае чытанне
	Усяго:	***2***	***8***		
	І курс, 1 семестр				***залік***

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

ЛІТАРАТУРА

Асноўная літаратура

1. Педагагічная рыторыка [Электронны рэсурс] : інтэрактыўны электрон. вучэб.-метад. комплекс па вучэб. дысцыпліне / склад. А. С. Васілеўская, А. С. Шырко // СДО Moodle БГПУ. – Рэжым доступу: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=5379. – Дата доступу: 27.03.2023.

Дадатковая літаратура

2. Каляда, А. А. Выразнае чытанне : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. пед. ін-таў / А. А. Каляда. – Мінск : Выш. шк., 1989. – 270 с.

3. Культура маўлення : курс лекцый / склад.: Н. І. Новік-Шчарбачэнка, Н. А. Барысенка. – Мазыр : Мазыр. дзярж. пед. ун-т, 2008. – 53 с.

4. Кубасова, О. В. Выразительное чтение : пособие для студентов сред. пед. учеб. заведений / О. В. Кубасова. – М. : Академия, 2011. – 144 с.

5. Рыданова, И. И. Культура речевого поведения учителя : пособие для студентов пед. специальностей вузов / И. И. Рыданова. – Минск : НПООО ПИОН, 2000. – 108 с.

6. Сидорович, З. З. Педагогическая риторика : учеб.-метод. пособие для студентов / З. З. Сидорович. – Гродно : Гродн. гос. ун-т, 2016. – 265 с.

7. Стариченок, В. Д. Культура речи : учеб. пособие / В. Д. Стариченок. – Минск : Выш. шк., 2015. – 303 с.

РЭКАМЕНДАВАНЫЯ ФОРМЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

Асноўнымі метадамі (формамі) навучання з’яўляюцца: метады праблемнага навучання, інтэрактыўныя метады, камунікатыўныя сітуатыўныя практыкаванні, метад праектаў.

ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Педагагічная рыторыка” прадугледжваецца прамежкавая і выніковая ацэнка.

Для кантролю якасці засваення ведаў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендуецца наступны дыягнастычны інструментарый:

тэст вучэбных дасягненняў,
вуснае і пісьмовае паведамленні,
распрацоўка партытуры,
выразнае чытанне тэкстаў,
публічнае выступленне,
залік.

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Мэтай самастойнай работы студэнтаў з’яўляецца авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі па педагагічнай рыторцы, вопытам публічных выступленняў. Самастойная работа студэнтаў спрыяе развіццю самастойнасці, адказнасці і арганізаванасці, творчага падыходу да рашэння праблем вучэбнага і прафесійнага ўзроўню.

Пры вывучэнні дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя формы самастойнай работы студэнтаў:

- падрыхтоўка і напісанне эсэ і іншых пісьмовых работ;
- рэдагаванне тэкстаў;
- падбор і аналіз літаратурных крыніц;
- распрацоўка і складанне схем, табліц;
- правядзенне аналізу тэкстаў розных стыляў, тыпаў і жанраў;
- выкананне практыкаванняў.

Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэтаў

№ п/п	Назва тэмы, раздзела	Колькасць гадзін на СРС	Заданне	Форма выканання
1	Паняцце пра	2	Фарміраванне	Складанне

	маўленчую дзейнасць		паняційнага апарата	гласарыя
2	Тэкст як прадукт маўленчай дзейнасці	2	Пошук і аналіз тэкстаў розных тыпаў	Выкананне практыкаванняў
3	Асноўныя тыпы маўлення	2	Пошук і аналіз тэкстаў розных тыпаў	Выкананне практыкаванняў
4	Стылі і жанры маўлення	2	Пошук і аналіз тэкстаў розных стыляў	Выкананне практыкаванняў
5	Правільнасць як галоўная камунікатыўная якасць маўлення настаўніка	4	Рэдагаванне тэкстаў	Выкананне практыкаванняў
6	Дакладнасць маўлення	4	Рэдагаванне тэкстаў	Выкананне практыкаванняў
7	Лагічнасць маўлення	2	Рэдагаванне тэкстаў	Выкананне практыкаванняў
8	Чысціня маўлення. Дарэчнасць маўлення. Сцісласць маўлення	2	Рэдагаванне тэкстаў	Выкананне практыкаванняў
9	Тэхніка маўлення	2	Падбор практыкаванняў на пастаноўку дыхання і голасу	Выкананне практыкаванняў
10	Артыкуляцыя і дыкцыя	2	Падбор практыкаванняў на пастаноўку дыхання і голасу	Выкананне практыкаванняў
11	Кампазіцыя публічнага маўлення	2	Пошук і апрацоўка матэрыялаў па тэме выступлення	Вуснае выступленне
12	Палемічнае майстэрства	4	Распрацоўка плана дыскусіі	Вуснае выступленне
13	Выразнае чытанне як мастацкая дзейнасць	2	Фарміраванне паняційнага апарата	Складанне гласарыя
14	Сэнсавы аналіз тэксту	2	Аналіз тэксту з прымяненнм розных прыёмаў	Распрацоўка сістэмы пытанняў па

			аналізу	тэксце
15	Асаблівасці чытання мастацкіх твораў розных жанраў	2	Аналіз тэксту з прымяненнм розных прыёмаў аналізу	Распрацоўка сістэмы пытанняў па тэксце
16	Асаблівасці чытання лірычных твораў	4	Распрацоўка партытуры і падрыхтоўка выразнага чытання верша	Выразнае чытанне
17	Чытанне драматычных твораў. Асаблівасці чытання твораў малых фальклорных жанраў	4	Распрацоўка сцэнарыя	Інсцэніроўка

Прыкладны пералік заданняў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

Лекцыі

Тэма ***“Спецыфіка публічнага маўлення. Падрыхтоўка публічнага маўлення”***

Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў

На аснове вывучэння матэрыялу [5] зрабіць канспект па тэме.

Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў

На аснове вывучэння тэарэтычнага матэрыялу [5] зрабіць табліцы па тэме.

Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў

На аснове вывучэння вывучэння тэарэтычнага матэрыялу [5] зрабіць схемы па тэме, выкарыстоўваючы платформу http://linoit.com.

Форма кантролю – Сусветнае кафэ

Практычныя заняткі

Тэма ***“Структура тэксту” (п/з)***

Узровень 1. *Выканаць заданні 1, 2, 4*

Узровень 2. *Выканаць заданні 1, 3, 5*

Узровень 3. *Выканаць заданні 1, 3, 6.*

Заданне 1. Запішыце азначэнні тэрмінаў: абзац, складанае сінтаксічнае цэлае, кампазіцыя, сюжэт, фабула

Заданне 2. Зрабіце канспект прапанаванага тэксту.

Універсальнай структурай тэксту з’яўляецца трохчасткавая кампазіцыя: ***уступ, асноўная частка*** і ***заканчэнне.***

Асноўнае правіла публічнага выступлення патрабуе, каб уступ і заключэнне па аб’ёме сумарна не перавышалі 1/3 ад усяго тэксту.

Трэба памятаць, што пачатак і канец любога паведамлення запамінаецца ярчэй за сярэдзіну, таму пачатак і заканчэнне выступлення павінны быць добра прадуманымі.

Задача *ўступу* – прыцягнуць увагу слухачоў, абудзіць цікавасць да тэмы, наладзіць кантакт з аўдыторыяй, падрыхтаваць да ўспрыняцця асноўнай часткі тэксту. Пры падрыхтоўцы ўступу можна выкарыстаць наступныя прыёмы: прывітанне і зварот да слухачоў, пастаноўка мэты выступлення, падкрэсленне значнасці тэмы і яе навізны, акрэсленне гістарычнага аспекту праблемы, дэманстрацыя нагляднасці, яскравы прыклад, цытата (паэтычная або афарыстычная), пытанне і інш.

Вырашыць задачы ўступу можна непасрэдна, адразу ўключыўшы слухача ў тэму, апасродкавана (праз цікавы прыклад, жыццёвую гісторыю,

цытату, шэраг пытанняў) ці нечакана (эмацыянальны зварот, рэзкае выказванне).

Асноўная частка раскрывае тэму выказвання, рэалізуе яго мэты і задачы. Выкласці матэрыял у гэтай частцы выступлення можна некалькімі спосабамі:

- *паралельным*, калі асобныя пытанні выступлення з'яўляюцца незалежнымі ў сэнсавых адносінах;
- *храналагічным*, калі асобныя пытанні падаюцца ў часавай паслядоўнасці;
- *лагічным*, калі паміж асобнымі пытаннямі існуюць прычынна-выніковыя сувязі. Пры лагічным спосабе выкладу можна вылучыць некалькі варыянтаў пабудовы тэксту: *дэдуктыўны* (ад агульнага да прыватнага), *індуктыўны* (ад прыватнага да агульнага), *па аналогіі* (на аснове падабенства).

Задачы *заключэння* – нагадаць галоўнае з выступлення, сфармуляваць выснову, узмацніць уражанне ад прамовы, заклікаць да дзеяння. Для рэалізацыі гэтых задач можна выкарыстаць наступныя прыёмы: паўтарыць асобныя палажэнні тэксту, сфармуляваць вывады ці высновы, прывесці яркую ілюстрацыю, зрабіць жартоўную заўвагу, прывесці цытату, задаць некалькі пытанняў, акрэсліць перспектывы далейшага вывучэння тэмы, выказаць удзячнасць за ўвагу і г. д.

Заключэнне можа быць прамым ці ўскосным: прамое заключэнне непасрэдна вынікае з астатніх палажэнняў выступлення, ускоснае заключэнне адрозніваецца навізной у адносінах да асноўнай часткі выступлення.

Заданне 3. На аснове тэксту, прыведзенага ў заданні 2, зрабіце схему.

Заданне 4. Прачытайце тэкст. Выдзеліце ўступ, асноўную частку і заключэнне.

Стаіць ён на высокай дудачцы. Лісце цёмна-зялёнае, круглавіднае. Жаўтатвары, яснавокі, вясёлы… Сонечнік, сонца – так называюць яго вясковыя людзі.

Падабаецца ён пчолам. Поўзаюць яны, збіраюць пылок з яго, і бубняць, і гудуць.

Яго круглы кошык – калыска для матылёў, якія мірна сабе ў ёй адпачываюць.

Калі з'явяцца сланечнікі, чорныя зярняты, не адыходзяць ад іх птушкі. Так і круцяцца каля іх! І газавай хусткай абвязваюць галоўкі сланечніка, і ставяць пудзіла…

Ён, нібы сонца, усіх вабіць…(С.Лоб.)

Заданне 5. Прачытайце тэкст, прыведзены ў заданні 4. Выдзеліце ўступ, асноўную часту і заключэнне. Вызначце тып уступу і заключэння, спосаб разгортвання думкі ў асноўнай частцы.

Заданне 6. Прачытайце тэкст, прыведзены ў заданні 4. Вызначце яго тэму і ідэю. Вызначыце від сувязі сказаў у тэксце. Выдзеліце ўступ, асноўную часту і заключэнне. Вызначце тып уступу і заключэння, спосаб разгортвання думкі ў асноўнай частцы.

Форма кантролю – круглы стол

Тэма ***"Багацце і выразнасць маўлення"***

Узровень 1 (азнаямленне, разуменне) – максімальная адзнака 6 балаў

На аснове вывучэння тэарэтычнага матэрялу [3, 6, 7] падрыхтуйце паведамленне на тэму "Сродкі выразнасці маўлення".

Узровень 2 (прымяненне, аналіз) – максімальная адзнака 8 балаў

На аснове вывучэння тэарэтычнага матэрялу [3, 6, 7] складзіце табліцу "Сродкі выразнасці маўлення". Прывядзіце прыклады з твораў, што вывучаюцца ў пачатковай школе.

Узровень 3 (сінтэз, ацэнка) – максімальная адзнака 10 балаў

Выберыце апавяданне з падручніка па літаратурным чытанні для 3 класа. Прааналізуйце сродкі выразнасці і іх ролю ў тэксце.

Форма кантролю – самастойны аналіз тэксту

Тэма **"Эмацыянальная выразнасць чытання"** (п/з)

Узровень 1. Выканаць заданне 1.

Узровень 2. Выканаць заданні 1 і 2.

Узровень 3. Выканаць заданні 1, 2 і 3.

Заданне 1. Дайце азначэнне, што такое ***інтанацыя***, назавіце ***кампаненты*** інтанацыі. На аснове аналізу літаратуры запішыце значэнне асноўных кампанентаў інтанацыі.

Заданне 2. Прачытайце ўрыўкі з твораў. Падумайце, якія кампаненты інтанацыі можна адпрацаваць на аснове гэтых твораў.

Тэкст 1.

Доўгі дзень,
Цёплы дзень,
Адплывае за аблокі.
Сіні цень,
Соны цень
Адпаўзае ў кут далёкі.
Збеглі зайкі ўсе ў лясы,
Змоўклі птушак галасы,
І буслы ў гняздо схавалі
Свае доўгія насы.
Баю-бай,
Баю-бай,
Вачаняты закрывай.

Тэкст 2.

Г.Аўласенка. Чыя мама лепшая

Адвячоркам мы гулялі
І аб мамах размаўлялі.

– У мяне, – прамовіў Пеця, –
Мама лепшая на свеце!
Усміхнуўся Толя: – Не!
Мама лепшая ў мяне!

– У мяне! – сказала Поля. –
Бо яна працуе ў школе!
– Ну дык што з таго, што ў школе! –
Запярэчыў Полі Коля.

– А мая кіруе крамай!
– А мая працуе... мамай
І цяпер з сястрычкай дома, –
Прашаптала ціха Тома.

Тэкст 3

М.Багдановіч. Перад паводкай

Праясняецца пагода,
Бо вярнулася вясна.
Ўсё чакаеш, што прырода
Ўстрапянецца ада сна.
І пад птушы крык і гоман,
Даўшы хвалям вольны ход,
Прыпадыме бацька Нёман
На хрыбце магутны лёд.

Зазвіняць жалобна крыгі,
І бурлівая вада
Снег, размоклы ў час адлігі,
Змые з луга без сляда.

Дык разлійся жа раздольна
Ў чыстым полі і гаю
І красой паводкі вольнай
Душу выпрастай маю!

Тэкст 4.

Завіруха

Вецер грае на дудзе,
Аж прастор увесь гудзе.
Пад такі шалёны грай
Скача бор і скача гай,
Наваколле стогне глуха –
Баль спраўляе завіруха.
Аляксей Бібіцкі.

Заданне 3. Падбярыце практыкаванні для фарміравання розных кампанентаў інтанацыі.

Форма кантролю – правядзенне практыкаванняў

Прыкладны пералік пытанняў да заліку

1. Прадмет і задачы педагагічнай рыторыкі. Спецыфіка педагагічных зносін.
2. Камунікатыўная сітуацыя і яе элементы.
3. Паняцце пра маўленчую дзейнасць. Этапы маўленчай дзейнасці. Вуснае і пісьмовае маўленне. Паняцце пра маналог, дыялог, палілог.
4. Віды маўленчай дзейнасці: слуханне, пісьмо, гаварэнне, чытанне.
5. Тэкст як прадукт маўленчай дзейнасці. Прыметы тэксту.
6. Структура тэксту. Абзац як кампазіцыйна-стылістычная адзінка тэксту. Кампазіцыя тэксту. Этапы стварэння тэксту.
7. Асноўныя тыпы маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне. Структура і моўныя асаблівасці тыпаў маўлення.
8. Стылі і жанры маўлення.
9. Культура маўлення як частка прафесійнай культуры настаўніка. Нарматыўны, камунікатыўны і этычны аспекты маўленчай культуры.
10. Маўленчы этыкет. Этыкетныя формулы. Нацыянальна-культурная спецыфіка маўленчых паводзін.
11. Камунікатыўныя якасці маўлення ў прафесійнай дзейнасці настаўніка.
12. Тыпы літаратурных моўных нормаў.
13. Тэхніка маўлення. Дыханне. Тыпы дыхання.
14. Моўны голас. Паказчыкі галасавых дадзеных.
15. Невербальныя сродкі зносін. Міміка і жэсты, іх класіфікацыя. Выяўленча-выразныя магчымасці жэстыкуляцыі.
16. Артыкуляцыя і дыкцыя.
17. Падрыхтоўка публічнага маўлення. Этапы падрыхтоўкі маўлення і іх змест.
18. Кампазіцыя публічнага маўлення. Распрацоўка плана. Метады выкладу матэрыялу.
19. Палемічнае майстэрства. Аргументацыя. Структура і ход дыскусіі.
20. Выразнае чытанне як мастацкая дзейнасць. Выканальніцкі аналіз, яго адрозненне ад літаратуразнаўчага.
21. Сэнсавы аналіз тэксту.
22. Лагічны аналіз твора. Маўленчы такт. Лагічныя паўзы. Лагічны націск.
23. Эмацыянальная выразнасць чытання. Інтанацыя чытання мастацкага твора. Кампананеты інтанацыі.

24. План распрацоўкі чытання мастацкага твора. Паняцце пра партытуру.

25. Расказванне народных казак.

26. Чытанне апавяданняў.

27. Чытанне баек.

28. Асаблівасці чытання лірычных твораў. Лірычны герой і чытальнік.

29. Чытанне драматычных твораў. Драматызацыя.

30. Асаблівасці чытання твораў малых фальклорных жанраў.

Пратакол узгаднення вучэбнай праграмы

Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне	Назва кафедры	Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па дысцыпліне	Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму
Беларуская мова	кафедра беларускага і рускага мовазнаўства	Змест праграм узгоднены на стадыі распрацоўкі	Пратакол № 10 ад 13.04.2023
Руская мова			
Методыка выкладання беларускай мовы			
Методыка выкладання рускай мовы			
Методыка развіцця маўлення			
Методыка выкладання літаратурнага чытання			
Фарміраванне білінгвальнага адукацыйнага асяроддзя			